«Вясна» — экстрэмісцкае фармаванне.
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

Намесніка старшыні КХП БНФ аштрафавалі за Дзяды і мітынг у Курапатах

09.12.2019 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Юрась Беленькі. Фота: svaboda.org

Мінскі раённы суд аштрафаваў Юрася Беленькага, намесніка старшыні КХП БНФ, на 765 рублёў. Пра гэта піша Радыё Свабода.

Палітыка пакаралі як арганізатара шэсця на Дзяды і мітынгу ў Курапатах 3 лістапада ў Мінску. Кіраўніцтва партыі, якое падала заяўку на акцыю, адмовілася складаць дамовы на паслугі з міліцыяй і камунальнікамі. Пра гэта быў складзены пратакол, які разгледзеў суддзя **Віктар Шаўцоў**.

Першае паседжанне па справе прайшло 3 снежня. Выслухаўшы Юрася Беленькага і сведку-міліцыянта, суддзя папрасіў Беленькага прынесці некаторыя дакументы ды перанёс разгляд справы на 9 снежня.

Аднак сёння, калі Юрась Беленькі паказаў запатрабаваныя дакументы, суддзя Шаўцоў далучыў іх да справы і адразу абвясціў вырак — штраф у 30 базавых велічынь.

> *«Гэта цалкам палітычнае і незаконнае рашэнне. Відавочны ціск на тыя палітычныя структуры, якія стаяць на пазіцыях адстойвання незалежнасці і гатовыя арганізаваць масавыя пратэсты супраць паглынання Беларусі Расіяй»*, — сказаў у каментары пасля суду Юрась Беленькі.

Палітык збіраецца абскардзіць пастанову Мінскага раённага суду і ў тым ліку накіраваць скаргу ў ААН. Апошні раз Юрася Беленькага штрафавалі за арганізацыю шэсця і мітынгу на Дзяды пяць гадоў таму.




"Гэта абсурд". Юрася Беленькага будуць судзіць за Дзяды

З-за неаплаты паслуг міліцыі і абслугоўвання тэрыторыі падчас шэсця на Дзяды на Юрася Беленькага быў складзены пратакол аб адміністрацыйным парушэнні па частцы 2 артыкула 23.34 КаАП.

Твитнуть








Праваабаронцы рыхтуюць дапаможнік пра мірныя сходы для беларусаў і беларусак замежжа

Палітзняволеную ўраджэнку Украіны асудзілі па "справе карагодаў" у Брэсце

"Тое, што зрабіў Раман Бандарэнка — гэта выбар асобы". Сведчанні ўдзельнікаў акцыі памяці на Плошчы Пераменаў

"Раман у дваццатым калене, выходзь!" Памяці Рамана Бандарэнкі




ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА


"Пусціўся ў слэм пад "Груз", а ў галаве — ўспаміны пра тыдзень у халодным ШІЗА..." Вялікая размова з экс-следчым, асуджаным па "справе карагодаў"

У анкахворага палітвязня прагрэсуе хвароба. Ён праходзіць курсы хіміятэрапіі ў турэмнай лякарні


Агляд навінаў палітвязняў з 27 лістапада па 5 снежня

Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя









АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Без канкрэтных доказаў мы можам застацца непачутымі". Што важна ведаць пра незалежнае назіранне за выбарамі*

Палітзняволеныя вясноўцы ў "спісе экстрэмістаў": хроніка пераследу 7-8 снежня

У анкахворага палітвязня прагрэсуе хвароба. Ён праходзіць курсы хіміятэрапіі ў турэмнай лякарні

Заява аб прызнанні 22 новых палітычных зняволеных

#FreeViasna ўзяла ўдзел у адвэнт-маркеце мерапрыемства "Беларусь у/і Еўропе"

Мінчука асудзілі за сарваны са сцяны інтэрната дзяржаўны сцяг


Праваабаронцы рыхтуюць дапаможнік пра мірныя сходы для беларусаў і беларусак замежжа

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Лістапад 2023







ПАРТНЁРСТВА



















СЯБРОЎСТВА







E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY